ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
1 09 2016 г.

Размеркаванне

# ЗНАЙДЗІ СВАЁ РЭЧЫШЧА

## З досведу інжынера-гідратэхніка

**Беларусь заўсёды славілася сваімі балотамі. Але іх вялікая прыродная каштоўнасць адыходзіла на другі план, калі ключавым станавілася пытанне сельскай гаспадаркі. Менавіта таму ў мінулым стагоддзі сапраўднай індустрыяй у БССР стала асушэнне забалочаных земляў і перавод іх у гаспадарчае карыстанне. У рэшце рэшт экалагічныя наступствы такой палітыкі заўважылі, і масавая меліярацыя была спынена. Тым не менш і сёння па ўсёй краіне працуюць людзі, якія даглядаюць ужо створаныя асушальныя сістэмы. Адзін з іх — малады спецыяліст Чэрвеньскага прадпрыемства меліярацыйных сістэм Павел ЯНЧУКОВІЧ.**

З хлопцам мы сустракаемся ў іншым рэгіёне Міншчыны — у Лагойскім раёне. Побач з вёскай Масцішча, што на рацэ Цна, інжынер-гідратэхнік разам з групай падначаленых дапамагае мясцовым калегам з ачысткай меліярацыйных сістэм. Брыгада рабочых, якой кіруе Павел, павольна рухаецца ўздоўж аднаго з каналаў. Мужчыны бензапіламі зразаюць непатрэбную расліннасць па яго берагах.

— Я родам з Гродзеншчыны, нарадзіўся ў Зэльве, — расказвае пра сябе хлопец. — Яшчэ ў дзяцінстве меў невялікі досвед працы «меліяратара», бо летам мы падпрацоўвалі ў мясцовым прадпрыемстве меліярацыйных сістэм (ПМС), дзе мой бацька быў кранаўшчыкам. Занятак быў простым: дапамагалі старэйшым укладваць дрэнаж, даглядаць каналы. Пасля школы паступіў у Беларускую дзяржаўную сельскагаспадарчую акадэмію ў Горках на спецыяльнасць «Меліярацыя і водная гаспадарка». Чаму выбраў гэтую ВНУ? Калі жывеш у пасёлку накшталт Зэльвы, сельскагаспадарчы кірунак у любым выпадку будзе бліжэй. Акрамя таго, туды паступала шмат маіх сяброў. Разам, як кажуць, весялей, і заўсёды ёсць да каго звярнуцца па дапамогу. Вучыцца ў Горках мне падабалася, зрэшты, думаю, у большасці людзей самыя добрыя ўспаміны пра сваё студэнцтва.

У пасёлак Смілавічы, дзе базуецца Чэрвеньскае ПМС, хлопец трапіў па размеркаванні. У сельскагаспадарчую акадэмію адтуль прыйшоў запыт адразу на двух спецыялістаў, і Павел разам з дзяўчынай, з якой пазнаёміўся ў Горках, вырашылі накіравацца туды. У Смілавічах маладым спецыялістам адразу выдзелілі два пакоі ў доме, які знаходзіцца на тэрыторыі ПМС. Пасля звальнення адной з супрацоўніц, якая займала трэці пакой, увесь будынак аказаўся ў карыстанні цяпер ужо маладой сям'і. У «інтэрнаце» ёсць гарачая вада і каналізацыя. Адзінае, што даводзіцца набываць, — газавыя балоны, але гэта дробязь у параўнанні з жыллёвымі праблемамі, з якімі сутыкаюцца многія маладыя спецыялісты.


Розніца ва ўзросце для супрацоўнікаў прадпрыемства — не праблема.
Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— У абавязкі інжынера-гідратэхніка ўваходзіць кіраўніцтва брыгадамі рабочых і афармленне патрэбных дакументаў, — уводзіць у курс справы Павел. — Калі казаць у глабальным сэнсе, то непасрэдна меліярацыю мы не праводзім. Як, у прынцыпе, не праводзяць яе і па ўсёй Беларусі. Наша галоўная задача — даглядаць ужо створаныя сістэмы, рэканструяваць іх. Напрыклад, недзе з цягам часу яны прыйшлі ў нягоднасць: каналы заіліліся, падняўся ўзровень вады, на берагах выраслі кусты... Мы ўсё прыводзім у належны стан, кладзём новы дрэнаж ці прамываем стары, пазбаўляемся ад расліннасці. Нават у Чэрвеньскім, здавалася б, не самым забалочаным раёне, дзясяткі тысяч гектараў меліяраваных зямель. Ёсць як сістэмы адкрытага тыпу — каналы, так і закрытага — дрэнаж. І за ўсім гэтым трэба глядзець. Цяжка нават уявіць, колькі работы ў меліяратараў, скажам, на Палессі.



Дзе-нідзе спецыялісты ПМС, наадварот, дэмантуюць старыя сістэмы. Напрыклад, нядаўна Павел з калегамі рэалізоўваў адзін з праектаў па Праграме развіцця Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

— У Савецкім Саюзе даволі шырока практыкавалася так званая лесамеліярацыя, — тлумачыць хлопец. — Яе вынікі да нядаўняга часу былі заўважаны ў Чэрвеньскім раёне. Каналы пракопваліся непасрэдна ў лясным масіве, каб асушыць глебу. Меркавалася, што гэта паспрые больш актыўнаму росту драўнінных парод, напрыклад, знікнуць так званыя «карлікавыя» сосны, а замест іх будзе расці паўнавартасны лес. Аднак гэта стратэгія не заўсёды спрацоўвала. Больш за тое, пачалася мінералізацыя тарфяніка з выкідамі шкодных рэчываў і вуглякіслага газу. Перыядычна здараліся моцныя пажары. Таму ААН выдзеліла сродкі на вяртанне гэтых земляў у першапачатковы стан. Мы будавалі перамычкі на каналах, каб вада заставалася ў глебе. Потым выконвалі такую ж работу ў Бярэзінскім раёне — перамаглі ў тэндары па забалочванні былой торфараспрацоўкі.

Большасць падначаленых Паўла — дарослыя мужчыны. Але хлопец кажа, што ніякіх праблем з кіраваннем калектывам у яго не было. Самае цяжкае, на яго думку, — працоўны графік. Павел выходзіць на работу з самага ранку (а 7-й гадзіне планёрка), а вяртаецца звычайна толькі позна вечарам. Нярэдка даводзіцца працаваць і па выхадных. Узімку работы значна менш — толькі высечка кустоў і чыстка каналаў. Сярэдні заробак не самы высокі — каля чатырохсот рублёў. Калі хлопец толькі ўладкоўваўся, плацілі больш, але эканамічныя праблемы не маглі абысці бокам і меліярацыю. Зрэшты, адсутнасць праблемы з жыллём часткова кампенсуе невялікі заробак.

— Цікавага ў рабоце хапае, — кажа хлопец. — У нас у арганізацыі ёсць унікальная тэхніка, досвед працы з ёй будзе вельмі карысным. Ёсць некалькі неблагіх экскаватараў Кохлнаўскага завода, бульдозеры «Беларус» і незвычайная машына — дрэваўкладчык ЭТЦ. Гэта такі шматкаўшовы экскаватар, які рые траншэі глыбінёй 1,5—2 метры і закладвае туды дрэнажныя трубы. Далёкіх планаў наконт сваёй будучыні я не маю, пакуль што буду працаваць тут, а далей — паглядзім.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*
*Мінск — Лагойскі раён — Мінск.*

Бачыць мэту

# СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ НА ЎСЕ ЧАСЫ,

## або Выратаванне з флакона

**З больш як трох тысяч супрацоўнікаў Барысаўскага завода медыцынскіх прэпаратаў амаль траціну складае моладзь. Адзін з такіх работнікаў — майстар вытворчага ўчастка Аляксей САЛАВЕЙ, які прыехаў у Барысаў па размеркаванні год таму.**

З маладым спецыялістам мы сустракаемся ў новым цэху прадпрыемства, які запрацаваў у канцы мінулага года. Галоўны профіль работы ў корпусе — стэрыльная рассыпка антыбіётыкаў. Па міжнародных стандартах гэты працэс павінен адбывацца ў асобным памяшканні. Менавіта для павелічэння экспарту на заводзе і было прынята рашэнне будаваць новы цэх. Наш візіт пачынаецца з гардэроба, дзе ўсе супрацоўнікі пераапранаюцца ў стэрыльнае адзенне. Абавязковае патрабаванне да некаторых — маскі-рэспіратары і акуляры.

— Я родам са Слуцка, пасля школы паступіў у Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт на факультэт тэхналогіі арганічных рэчываў, — расказвае пра сябе наш герой, пакуль мы надзяваем халаты, шапачкі і бахілы. — Спецыяльнасць выбраў даволі папулярную — біятэхналогія, бо гэта той кірунак, які заўсёды будзе перспектыўным. Патрэба на спецыялістаў, якіх там выпускаюць (а па дыпломе я інжынер-хімік-тэхнолаг), заўсёды высокая. Скажу адразу, што мэтанакіравана хацеў трапіць менавіта ў Барысаў. У гэтага прадпрыемства вельмі добрая рэпутацыя сярод студэнтаў. Многія, са слоў выпускнікоў, ведаюць, што тут дастойныя ўмовы працы і высокія заробкі. Па сярэднім бале дыплома я выбраў месца размеркавання адным з першых і адразу ж назваў Барысаў.

Месца жыхарства прадаставіў наймальнік. Для маладых спецыялістаў завод выкупіў некалькі кватэр і абсталяваў іх усім патрэбным для жылля. У адну з такіх і засялілі Аляксея, ён аплачвае толькі камунальныя паслугі. Хлопец з задавальненнем канстатуе, што старэйшыя калегі адразу прынялі яго як свайго. Разам з ім на прадпрыемства прыехала некалькі аднакурснікаў, таму сумаваць не давялося. Больш за тое, ужо праз некаторы час хлопец перавёз у Барысаў сваю дзяўчыну (цяпер жонку), з якой яны вучыліся ў адной групе, — спецыялістку змаглі пераразмеркаваць.



— У абавязкі майстра ўваходзіць арганізацыя вытворчасці прэпарата ў самым шырокім сэнсе, — тлумачыць Аляксей. — Штодзень я павінен правярыць працаздольнасць вытворчай лініі, кожнага яе элемента, а таксама выкананне супрацоўнікамі мер бяспекі. Я кантралюю, каб хапала сыравіны, калі яе нестае — афармляю дакументы на пастаўку. Агулам праца больш папяровая, але вырашаць даводзіцца самыя розныя пытанні. Усяго ў маім падпарадкаванні больш як 80 чалавек. Так, адказнасць вялікая, але гэта кампенсуецца неверагодным досведам працы на самым сучасным абсталяванні і добрым заробкам.

Аляксей праводзіць невялікую экскурсію па памяшканнях цэха, якім ён загадвае. Тут адбываецца стэрыльная рассыпка антыбіётыкаў цэфаласпарынавага рада, якія маюць вельмі шырокі спектр дзеяння. Першае, што кідаецца ў вочы, — шкло, якое аддзяляе пачатак лініі ад астатніх памяшканняў. Заходзіць пабочным асобам туды падчас работы забаронена, усе супрацоўнікі (дазіроўшчыкі) апрануты ў форму, якая хутчэй нагадвае скафандры. Як тлумачыць майстар, тут захоўваецца клас чысціні В. Вышэй за яго толькі клас А — у памяшканнях такога кшталту працуюць выключна робаты.

Усё пачынаецца з падрыхтоўкі флаконаў, якія набываюць у Расіі. Тут іх падаюць у мыечную машыну, дзе яны праходзяць ачыстку вадой пры тэмпературы 90 градусаў. Далей — стэрылізацыя пры тэмпературы 320 градусаў па Цэльсії. Пасля падыходзіць важнейшы этап — у так званай «зоне» фасовачная машына рассыпае антыбіётык па флаконах ідэальна роўнымі дозамі. Наступны этап — закаркоўванне.

— Усё абсталяванне тут абсалютна новае, італьянскае, — расказвае Аляксей. — Яно вельмі якаснае і «гнуткае»: усяго за суткі мы можам цалкам пераналадзіць лінію на выпуск іншага прэпарата. Тэхніка дазваляе выпускаць каля 250 тысяч флаконаў за дзень. Завод працуе кругласутачна — у тры змены. Для мяне змены чаргуюцца па тыднях — спачатку дзённая, потым вячэрняя і начная.

На кожнай наступнай стадыі ўздзел у вытворчасці бярэ ўсё больш людзей. Далей, напрыклад, да работы прыступаюць кантралёры — яны візуальна правяраюць напоўненасць флаконаў, адбракоўваюць пашкоджаныя. Вага замяраецца аўтаматычна. Напрыканцы шклянкі маркіруюцца, на іх наносяцца серыя і тэрмін прыгоднасці. Апошняя стадыя — упакоўка ў скрыні. Заўважаем рэгіён прызначэння — Узбекістан. Па словах Аляксея, больш за 70% прадукцыі цэха ідзе на экспарт, у асноўным у краіны СНД.

— Уражанні ад працы ў мяне самыя выдатныя, — прызнаецца малады спецыяліст. — Я адчуваю, што раству прафесійна, а гэта вельмі важна. Нядаўна вось прайшоў курсы па павышэнні прафесійнага майстэрства, якія для нас праводзіў спецыяліст з Украіны. Неўзабаве я адпраўлюся на стажыроўку ў Кіеў, туды мяне накіраваў завод. На прадукцыю фармацэўтыкі заўсёды будзе попыт, таму за сваю будучыню я спакойны.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*
*Мінск — Барысаў — Мінск.*


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.
Вопыт работы на самым сучасным абсталяванні — адна з пераваг прадпрыемства.